**Разынкі і пярчынкі**
*або Занатоўкі ў дзённік*

## Флейта, фагот і раяль

***Мой знаёмы музыкант любіць параўновываць музычныя інструменты з жанчынамі. Не па знешняму выгляду, а за гучанне, у якім знайшлі ўвасабленне адметныя якасці жаночага характару. Як у кожнай жанчыны свой тэмперамент і менталітэт, так і кожны інструмент мае своеасаблівы тэмбр, гукавы дыяпазон і шырыню рэгістра. Гітара – жанчына рамантычная, непрадказальная, тэмпераментная, як іспанскі танец фламенка. Скрыпка – сама вытанчанасць, выразнасць, душэўнасць. Гэта жанчына, у якой за знешняй сціпласцю хаваюцца пачуцці глыбокія, трывалыя. Фартэпіяна – узор натуры духоўна багатай і шчодрай. Флейта… Вось флейту мой знаёмы любіць найбольш, таму што гэта прататып сапраўднай жаноцкасці – ад паказальнай легкадумнасці і халаднаватай грацыёзнасці да раптоўнага пераўвасаблення ў супрацьлеглыя якасці і віртуознага авалодвання законамі гармоніі і правіламі жыцця.***



Камерны ансамбль салістаў “Вытокі” адкрыў музычны фэст “Год Агінскага ў Залессі”. Аматары класічнай музыкі з Мінска, Маладзечна і Смаргоні атрымалі асалоду ад выканальніцкага майстэрства музыкантаў і змястоўных экскурсаў у гісторыю старасвецкай музыкі, якімі ўпрыгожыў выступленні калектыву кіраўнік праекта, фагатыст Аляксей Фралоў. Сяргей Махаў выконваў партыю флейты, Ірына Аўдзеева – фартэпіяна. І хоць візуальна на сцэне прысутнічага адна жанчына, на самой справе іх было чатыры, з якіх тры - нябачныя фантомы, што гучалі паланэзамі, мазуркамі, рамансамі, ствараючы атмасферу калішніх “Паўночных Афінаў”.

Першы канцэрт фэсту меў назву “Музычныя скарбы Агінскіх”. У праграму ўвайшлі творы славутага гаспадара Залескай сядзібы, а таксама іншых прадстаўнікоў гэтага роду і таленавітых сучаснікаў Міхала Клеафаса. Многія музычныя творы вярнуліся з небыцця, дзякуючы дбайнасці даследчыкаў

музычнай спадчыны краю і апантанасці музыкантаў, што разгледзелі ў старажытных партытурах сапраўдныя дыяменты і пярлінкі мастацтва. І хоць многія падарожнікі едуць у Залессе з надзеяй пачуць тут найперш самы знакаміты паланэз Ля-мінор пад назвай “Развітанне за Радзімай”, салісты ансамбля распачалі канцэрт паланезам Соль-мажор – сонечным, таму што нота “соль” і азначае ў перакладзе сонца. Дарэчы, і назва “Развітанне з Радзімай” ставіцца пад сумніў асобнымі даследчыкамі творчасці Міхала Клеафаса Агінскага. Існуе меркаванне, што сам аўтар яго называе “Блаславенне Айчыны”. Ці не таму ў сядзібе “Паўночныя Афіны” стала добрай традыцыяй слухаць гэты паланэз стоячы.



Прагучалі ў канцэрце творы Міхала Казіміра Агінскага, таемнага і малавядомага Караля Агінскага, Станіслава Манюшкі і іншых. Ва ўтульнай зале, якой дарэчы летась споўнілася 200 гадоў, жывая і несмяротная музыка гучыць асабліва. Чысціня гукаў, здаецца, ачышчае душу, а меладычны малюнак ураўнаважвае эмацыянальны стан вібрацыямі паветра, прасякнутага сапраўднай прыгажосцю. Аўтара аднаго з прагучаўшых вакальных цыклаў “Да Касі” Міхала Казіміра, кажуць, называлі жартам “гетман-кларнет”. Але гэта мне падстава для далейшых разважанняў пра адпаведнасць мужчынскіх характараў музычным інструментам. І гэта ўжо зусім іншая гісторыя…

**Ала СТРАШЫНСКАЯ.**
**Фота аўтара.**